ШАНУЕМ ТРАДЫЦЫІ І ПАМЯЦЬ

Урачыстае ўскладанне кветак да манумента Перамогі і Вечнага агню адбылося ў Мінску. Мерапрыемства прайшло ў гонар Дня абаронцаў Айчыны і 100-годдзя Узброеных Сіл Беларусі. На плошчы Перамогі прадстаўнікі міністэрстваў, арганізацый і замежныя госці прынялі ўдзел ва ўрачыстай цырымоніі. Шэсце суправаджалі рота ганаровай варты і ваенны аркестр.

«Дзень абаронцаў Айчыны і 100-годдзе Узброеных Сіл — паказчык таго, што ў Беларусі на высокім узроўні шануюць і не забываюць подзвіг ветэранаў. Мы хочам, каб у нас былі мір і спакой, каб наша шчасце было забяспечана абаронай

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

нашай Айчыны. Мне хацелася б павіншаваць усіх ветэранаў, жыхароў сталіцы і ўсёй краіны з гэтым святам. І хай наша моладзь заўсёды будзе гатовая да абароны Айчыны», — сказаў журналістам **старшыня Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў генерал-маёр у адстаўцы Анатоль АДОНЬЕЎ.**

У мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі Міністэрства абароны на чале з **міністрам Андрэем РАЎКОВЫМ, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Мар'яна ШЧОТКІНА,** прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, ветэраны.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

ДЫЯЛОГ ПА СУБОТАХ

Прамыя тэлефонныя лініі пройдуць традыцыйна 24 лютага ў Мінгарвыканкаме і аблвыканкамах краіны. На тэлефонныя званкі з 9.00 да 12.00 будуць адказваць:

першы намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Мікалай Васілевіч ТОКАР. Тэл. 8 016 221 31 21;

першы намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8 021 222 22 22;

першы намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Аляксандр Віктаравіч МІКАЛУЦКІ. Тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч ВАРОНІН. Тэл. 8 022 250 18 69;

намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Сяргей Пятровіч НЕЎМЯРЖЫЦКІ. Тэл. 8 017 500 41 60;

старшыня МІНСКАГА гарсавета дэпутатаў Васіль Васілевіч ПАНАСЮК. Тэл. 8 017 222 44 44.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

«Газета стала роднай»

Раіса ГРАМЫКА, пенсіянерка з вёскі Вялікі Поўсвіж Лепельскага раёна:

— «Звязду» выпісваю з 1990 года. Шаную і іншыя газеты, але калі б замест «Звязды» мне прапанавалі падпісацца на іншае выданне, ні ў якім разе не пагадзілася б. Газета ўжо стала сваёй, роднай. Адкрываю чарговы нумар і адразу ведаю, што буду чытаць. Шчыра кажу, мяне многія тэмы цікавяць. Магчыма, штосьці і не спатрэбіцца ў жыцці, але для агульнага развіцця лішнім не будзе.

Як кажуць мае дзеці, дзякуючы «Звяздзе» я падкаваная ў заканадаўстве. Пра новыя ўказы, змены ў законах яны даведваюцца ад мяне, а я, у сваю чаргу, — з газеты. Аднойчы апублікаваны «Звяздой» указ дапамог майму сыну атрымаць дзяржаўную датацыю, на якую ён меў права.

А як жа прыемна атрымліваць ад любімай газеты падарункі! Мне шанцуе — выйграю ўжо другі раз. У 2012 годзе выйграла электрычную мясарубку, летась — вяндлярню. Буду працягваць удзельнічаць у розыгрышах, як і чытаць родную «Звязду».

Геаграфія атрымання беларусамі пенсій можа пашырыцца

Цяпер Міністэрства працы і сацыяльнай абароны працуе над заключэннем міжнародных дагавораў аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнага забеспячэння з Эстоніяй, Чэхіяй і Польшчай. Пра гэта «Звяздзе» расказала начальнік управалення арганізацыі пенсійнага забеспячэння Мінпрацы і сацыяльнай абароны Алена ДРОНАВА.

— Гэтыя дагаворы будуць пабудаваны на прапарцыянальным прынцыпе, — заявіла Алена Дронава. — Гэта значыць, што кожная з дзяржаў будзе прызначаць і выплачваць пенсію за працоўны стаж, зароблены на яе тэрыторыі. То-бок, за работу, напрыклад, у Польшчы будзе плаціць польская дзяржава, за работу ў Беларусі — Беларусь.

Міжнародныя дагаворы аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнага забеспячэння на прапарцыянальным прынцыпе ўжо заключаны з Расіяй, Літвой, Латвіяй і Азербайджанам.

Па словах прадстаўніка Мінпрацы і сацабароны, таксама вядзецца работа па заключэнні міжнароднага дагавора ў пенсійнай сферы з дзяржавамі ЕАЭС. «Фініш ужо відаць», — заявіла Алена Дронава.

Сярэдні памер прызначаных месячных пенсій у Беларусі ў лютым склаў 314,82 рубля. Сярэдні памер прызначаных пенсій па ўзросце — 323,16 рубля.

* * *

Такія дагаворы маюць яшчэ адзін станоўчы аспект, на які хацелася б звярнуць увагу. Так, згодна з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні», пенсіі прызначаюцца грамадзянам, якія пражываюць у краіне пастаянна. Пры выездзе пенсіянера на пражыванне ў іншую краіну выплата пенсіі спыняецца. Але заключэнне міжнародных дагавораў па пенсійным забеспячэнні стварае эфектыўны механізм захавання пенсійных правоў пры перасяленні чалавека на месца жыхарства ў іншую дзяржаву. Гэта значыць, калі беларускі пенсіянер з'едзе на пастаяннае жыхарства ў краіны далёкага замежжа, з якімі ў Беларусі адсутнічаюць міжнародныя дагаворы аб пенсійным забеспячэнні, выплата пенсіі яму спыніцца. Мяркуецца, што далейшае пенсійнае забеспячэнне чалавека будзе ажыццяўляцца ў залежнасці ад заканадаўства дзяржавы перасялення. Калі ж з іншай дзяржавай заключаны дагавор аб супрацоўніцтве ў галіне сацыяльнага забеспячэння, то выплата пенсіі такому пенсіянеру будзе працягнута.

Святлана БУСЬКО.

■ Справы духоўныя

Мошчы Матроны ў сталіцы

У храме святога дабраверна-га князя Аляксандра Неўскага ў Мінску з 25 лютага да 13 мая гэтага года будзе знаходзіцца ікона святой блажэннай Матроны Маскоўскай з часціцай мошчаў.

Падзея адбываецца па благаславенні Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Паўла, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі. Святыня з'яўляецца дарам Свяцейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Алексія II Гродзенскаму Раство-Багародзічнаму стаўрапігіяльнаму жаночаму манастыру.

Блажэнная Матрона Маскоўская — падзвіжніца з блізкага нам XX стагоддзя, адна з самых любімых сёння праваслаўных святых. Жанчыну-інваліда, невідушчую ад нараджэння і пазбаўленую магчымасці хадзіць, Бог удастоіў дару цудатварэння і празорлівасці. Вернікі шануюць блажэнную Матрону як вялікую малітвенніцу, якая дапамагала блізкім пры сваім зямным жыцці і працягвае адгукацца на просьбы шчырых сэрцаў зараз, знаходзячыся ў Царстве Нябесным.

Прыбыццё святыні ў Аляксандра-Неўскі храм (горад Мінск, вуліца Казлова, 11) адбудзецца 25 лютага ў 9:45. Плануецца, што для пакланення вернікаў ікона будзе даступная штодня з 8:00 да 20:00. Адбудзе святыня 13 мая, прыкладны час провадаў — 12:30.

Вераніка ПУСТАВІТ.

У Бабруйску газаўшчыкі выратавалі на пажары пенсіянера

Сітуацыя наогул атрымалася нетыповая. Жыхарам шматпавярховіка па вуліцы Леніна здалося, што на першым паверсе іх дома пахне газам, і яны забілі трывогу. На сігнал прыехала газавая аварыйка. Але яшчэ на падыходзе да дома супрацоўнікі Магілёўаблгаза — слесар Аляксандр Капачоў і кіроўца Аляксандр Патупчыкаў убачылі, што з падвала ідзе дым. Яны адразу ж патэлефанавалі ратавальнікам і выклікалі хуткую дапамогу, а самі кінуліся правяраць, што гарыць. Сярод дыму яны знайшлі чалавека, які ўжо не мог перамяшчацца самастойна. Мужчыны выцягнулі яго на паверхню і перадалі падаспеўшай брыгадзе хуткай дапамогі. «На шчасце, агонь не паспеў разгарэцца, хутка быў знойдзены ачаг узгарання і аператыўна ліквідаваны», — паведаміў **Яўген ТОЎСЦІК, інспектар групы прапаганды і ўзаемадзеяння з грамадскасцю Бабруйскага гаррайадцзела па НС.** Прычыны пажару высвятляюцца.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

«ІНТЭРНЭТ-ЛІКБЕЗ» ДЛЯ ПЕДАГОГАЎ

Як правільна настаўніку кантактаваць з вучнямі ў інтэрнэце і выкарыстоўваць глабальную сетку для адукацыйных мэт? Якую інфармацыю карэктна публікаваць на сваёй старонцы ў сацыяльных сетках і ці можна лічыць асабістую старонку настаўніка «асабістай»? Гэтыя пытанні абмеркавалі ў Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя Аркадзя Куляшова, дзе прайшла адкрытая лекцыя для педагогаў рэгіёна.

Спікерам мерапрыемства, арганізаванага Міністэрствам адукацыі Беларусі і кампаніяй МТС, стала дацэнт, кандыдат псіхалагічных навук, пазаштатны супрацоўнік Фонду развіцця інтэрнэта Вікторыя Ізмагурава. Як адзначыла эксперт, сёння існуюць дзве асноўныя мадэлі паводзін педагога ў інтэрнэце. Адна з іх — адмова ад зносін з вучнямі, захаванне асабістай прасторы і свайго жыцця ад старонніх. З пункту гледжання выхавання і даверу такі шлях менш эфектыўны. Другая мадэль паводзін — далучэнне вучняў у «сябры» і актыўныя стасункі з імі. «Безумоўна, гэта патрабуе ад педагога высокага ўзроўню інфармацыйнай культуры, каб «быць у тэме» і ўплываць на працэс асобаснага станаўлення сваіх вучняў», — лічыць Вікторыя Ізмагурава.

«Інтэрнэт-прастора — натуральнае «асяроддзе пражывання» сучасных школьнікаў. Віртуальныя стасункі часам пераважаюць над рэальнымі. Неабходна ўлічваць, што школьнікі маюць доступ не толькі да акаўнтаў аднагодкаў, але і да старонак сваіх педагогаў у сацыяльных сетках. Падлеткі, праглядаючы інтэрнэт-профіль, вольна ці міжволі супастаўляюць вобраз настаўніка ў сеціве і ў рэальным жыцці. Таму вельмі важна, каб гэтыя вобразы супадалі. Падобныя мерапрыемствы дапамагаюць педагогам знайсці адказы на свае пытанні, выбудаваць правільны вектар паводзін у сацыяльных сетках і спрыяюць падтрыманню іх станоўчага іміджу ў інтэрнэт-прасторы», — пракаментаваў падзею **дырэктар Галоўнага інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Павел ЛІС.**

Паводле даных даследаванняў Лабараторыі Касперскага, каля 90 % дзяцей штодня заходзяць у інтэрнэт, пры гэтым кожны трэці праводзіць у сеціве ад 3 да 5 гадзін, кожны шосты — ад 5 да 8 гадзін. Таксама ўстаноўлена, што 90 % педагогаў выкарыстоўваюць сацыяльныя сеткі ў асабістых мэтах і 73 % працэнты дадаюць сваіх вучняў у «сябры».

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Ну і ну!

Падлеткі разграмілі прыпынак

Смалявіцкім раённым аддзелам Следчага камітэта распачата крымінальная справа аб хуліганстве, учыненым групай падлеткаў. Падазраванымі прызнаныя сем навучэнцаў розных навучальных устаноў раёна. Старэйшы з фігурантаў — 17-гадовы ліцэіст, самая малодшая — 14-гадовая вучаніца 8 класа.

Па даных следства, увечары некалькі кампаній падлеткаў знаходзіліся на прыпынку пасля вясковай дыскатэкі. Чакаючы аўтобус, непаўналетнія наўмысна з хуліганскіх меркаванняў сталі ламаць рукамі і нагамі павільён прыпыначнага пункта, пашкодзіўшы пры гэтым 16 панэляў з металапрофілю. Падлеткі з іншай кампаніі назіралі за тым, што адбываецца, і здымалі відэа на мабільны тэлефон. Калі пад'ехаў аўтобус, непаўналетнія раз'ехаліся па дамах. Аб пашкоджанні маёмасці паведамілі ў міліцыю на наступны дзень работнікі дарожнай службы.

Следства збірае матэрыялы, якія характарызуюць падазраваных. Следчыя дзеянні праводзяцца з удзелам іх законных прадстаўнікоў. Устанаўліваецца памер нанесенай шкоды. Да матэрыялаў крымінальнай справы далучаны відэазапіс таго, што адбылося.

Сяргей РАСОЛЬКА